## № 73. Язэпу Пушчу

*27.VIII.1934*

Дарагі браце Язэп!

Даўно ўжо нічога ад цябе не чуваць. Хацелася б ведаць, як жывяце Вы там, на ўздальлі? А яшчэ хацелася б мець Вашу фатаграфічную картку. Вы, пэўна, зьнімаліся. Дык от, Язэп, вялікая просьба — прышлі нам картку. Нашы дзеці вельмі часта ўспамінаюць Галю і Лялю. А яны ўжо вялікія. Сёлета зьняліся мы ўсёй сям'ёй. Хацелі і Вам паслаць картку, дык ня пэвен я ў адрасе тваім. Гэтак даўно не пісаў, мо пераехаў на другую кватэру. Пішы, Язэп. Я працую ў Горце бухгальтарам. Аня настаўнічае.

Вітаньне ад усёй сям'і Вам усім. Цалую цябе.

Твой *Адам*.

Адрас наш: Слабадской, Демьянка, Советская, 20.

## № 74. Алесі Бабарэцы

*12 сьнежня 1934 г.*

Слаўная Лялечка!

Ты просіш коцікаў і цукерак прыслаць. Коцікаў нідзе я не знайшоў: няма іх тут. А цукерак я паслаў праз дзядзьку аднаго, Раманава. Калі іх Вам не перадалі, дык скажы, Ляля, маме, каб схадзіла сама і забрала. Ты, Ляля, маладзец, што ўжо навучылася чытаць па пісанаму. Вот я табе і ліст пішу, каб ты сама чытала і сама адказ напісала. Пішы, як ты гуляеш з Лораю, як у садзе гуляеш. Табе шле *[далей паштоўка абрэзана]*

Цалую цябе моцненька.

Твой бацік *Адам*.

## № 75. Элеаноры Бабарэцы

*[12 сьнежня 1934 г.]*

Слаўная мая Лорачка!

Ліст твой прышоў да мяне і вельмі я рад быў чытаць, што піша мне мая Лорачка. Ліст ты напісала добра і памылак зрабіла мала. Я паказаў твой ліст дзядзю Антосю, і ён пахваліў цябе, сказаў, што ты добра пішаш. Я вельмі рад, што ты папраўляешся ўжо, што ты ўжо і бегаць навучылася. Ты хутка набярэшся сілы зусім і пойдзеш зноў у школу. Ты, мусіць, саскучылася па ёй вельмі. Мама пісала, каб я пашукаў табе і Лялі шапачак. Я хадзіў у магазіны ды не знайшоў. Няхай мама аддасьць Вам пашыць капары, а як будуць тут шапкі, я куплю. Ці гатова тваё паліто? Пішы, Лорачка, тату лісты, я буду вельмі рад. Прывітаньне табе ад дзядзі Антося. Цалую цябе моцна.

Твой *тата*.

Пацалуй ад мяне, Лорачка, мамуську нашу і моцненька яе абнімі.